**17 жніўня 2024 г. – 120 гадоў з дня нараджэння Аляксандры Іванаўны Федасюк (1904–1995), дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, удзельніка партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дзяржаўнага дзеяча**



Аляксандра Іванаўна Федасюк нарадзілася 17 жніўня 1904 года ў вёсцы Андронава Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці) у шматдзетнай сялянскай сям'і. У пачатку Першай сусветнай вайны яе бацька пайшоў на фронт, а неўзабаве маці з чатырма дзецьмі на руках, старэйшай з якіх, Александры, споўнілася дзесяць гадоў, была эвакуіравана ў глыб Расіі, пад Арэнбург.

Аляксандра вучылася ў сярэдняй школе, а па вечарах разам з моладзю збіралася на камсамольскія зборы, на заняткі ўсёнавуча, дзе абмяркоўваліся навінкі літаратуры, агучваліся мары аб будучыні. Калі скончылася вайна, Іван Федасюк адшукаў сваю сям'ю пад Арэнбургам і вырашыў, што час вяртацца на дзедаўскую зямлю.

Кобрыншчына ў той час знаходзілася пад уладай буржуазна-памешчыцкай Польшчы. У Кобрыне Аляксандру чакалі новыя ўзрушэнні, несправядлівасць, з якой яна сутыкалася на роднай зямлі. Некалькі гадоў ад цямна да цямна працавала на пана Зялінскага. Мара аб працягу вучобы была пахавана назаўжды. Але ні што не магло знішчыць мару дзяўчыны аб чалавечым жыцці, якое яна спазнала ў Савецкай Расіі.

Імкненне да высокіх ідэалаў, жаданне змагацца супраць прыгнятальнікаў супала з тактыкай рэвалюцыйнай барацьбы. У маі 1925 года Аляксандра Федасюк уступіла ў КПЗБ, у хуткім часе стала прафесійным рэвалюцыянерам-падпольшчыкам, выконвала адказныя партыйныя даручэнні. Яна была важаком моладзі, вяла агітацыю сярод сялян, рамеснікаў. «Надзя», «Стася», «Даша» - пад гэтымі імёнамі дзейнічала маладая рэвалюцыянерка. Жанчынай-легендай называлі яе паплечнікі па партыі, па ўдзеле ў рэвалюцыйнай барацьбе на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў гады панавання ў ёй польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Агенты польскай дэфензівы праследавалі актыўнага работніка, тройчы арыштоўвалі і заключалі ў турму (1927, 1930–1931, 1937–1939), разлучалі з маленькай дачкой Уладзіславай. З вялікай цяжкасцю таварышам па барацьбе ўдалося пераправіць дачку А. І. Федасюк праз мяжу, у Мінск, да мужа Мікалая Паўлавіча Маслоўскага (1905–1938), віднага камсамольскага работніка, які таксама працаваў у Заходняй Беларусі. Каля чатырох гадоў правяла Аляксандра Федасюк у турме, адчула жорсткія і абразлівыя допыты, але не схіліла галовы.

З 1926 года А. І. Федасюк – член Кобрынскага падпольнага райкама, з 1928 года – член Брэсцкага падпольнага акруговага камітэта КПЗБ. Закончыла школу партыйных кадраў КПЗБ у Мінску (1929), Камуністычны ўніверсітэт нацыянальных меншасцей Захаду ў Маскве (1934).

Займала розныя партыйныя і дзяржаўныя пасады: сакратар Навагрудскага акруговага камітэта КПЗБ (1931–1932), сакратар ЦК КСМЗБ (1929–1930, 1932, 1935–1937), навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б (1934). Дэлегат I (1928), II (1935) з’ездаў КПЗБ, VI кангрэсу Камуністычнага інтэрнацыяналу моладзі (1935).

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 годзе А. І. Федасюк – дэпутат Народнага сходу Заходняй Беларусі ў Беластоку, член яго паўнамоцнай камісіі на сесіі Вярхоўнага Савета СССР. Актыўна ўдзельнічала ў падзеле панскай зямлі, арганізоўвала палітычную і культурную работу ў вёсках. Працавала старшынёй Кобрынскага гарвыканкама, была абрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, а ў 1941 годзе яе зацвердзілі намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Аляксандра Іванаўна выбралася з пылаючага Брэста на ўсход, дабралася да Масквы, затым ў Пензу, адкуль яе адазвалі ў распараджэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху. У хуткім часе А. Федасюк была закінута ў Беларусь, у глыбокі варожы тыл. Сферай яе дзейнасці сталі шэсць партызанскіх атрадаў, якія кантралявалі тэрыторыю на паўднёвым усходзе Брэсцкай вобласці. Пры непасрэдным удзеле Аляксандры Федасюк быў сфарміраваны буйны партызанскі атрад імя В. І. Чапаева, створаны партыйная і камсамольская арганізацыі. Потым атрад ператварыўся ў магутную баявую адзінку, на яго базе

была створана партызанская брыгада імя В. І. Чапаева, якая дзейнічала ў Кобрынскім і Антопальскім раёнах.

Рашэннем ЦК ВКП(б)Б ад 24 чэрвеня 1943 года Аляксандра Федасюк была зацверджана членам Брэсцкага падпольнага абкама партыі, а 4 снежня таго ж года - сакратаром Дзівінскага падпольнага райкама КП(б)Б, які базіраваўся ў партызанскім атрадзе імя М. А. Шчорса.

Пасля вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў А. І. Федасюк займалася гаспадарчай дзейнасцю. На кіруючых пасадах (з 1944 г. па 1957 г.) у якасці першага сакратара Кобрынскага райкама КПБ, сакратара Брэсцкага і Маладзечанскага гаркамаў партыі, загадчыка аддзела ЦК КПБ А. І. Федасюк заўсёды адрознівалася ўважлівымі і чулымі адносінамі да праблем людзей. «Абавязкова падтрымаем, дапаможам, разбярэмся», - такой была яе жыццёвая пазіцыя.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 1-га склікання (1940–1947), Вярхоўнага Савета СССР 2-га і 3-га скліканняў (1946–1954). Член ЦК КП(б)Б у 1949–1952 гадах. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Аляксандра Іванаўна Федасюк памерла 29 мая 1995 года. Яе лёс і пройдзены шлях, доўгае, напоўненае сэнсам жыццё сталі прыкладам таго, як выхадцу з сялянскай глыбінкі можна дабіцца грамадскага прызнання, павагі і любві.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2019 г., дапоўнены ў 2024 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

**Хаўратовіч І. П.** Федасюк Аляксандра Іванаўна / І. П. Хаўратовіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2003. – Т. 16. – С. 344.

**Хаўратовіч І. П.** Федасюк Аляксандра Іванаўна / І. П. Хаўратовіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1974. - Т. 10. – С. 553–554 : фат.

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5 : біяграфічны даведнік. – С. 618 : фат.

**Федосюк Александра Ивановна** // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1982. – Т. 5. Биографический справочник. – С. 647-648 : фот.

**Хавратович, И. П.** Федосюк Александра Ивановна / И. П. Хавратович // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 433.

**Хаўратовіч, І. П.** Федасюк Аляксандра Іванаўна / І. П. Хаўратовіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 29 : фат.

**Шавяла, Р. М**. Брэсцкі падпольны абком ЛКСМБ / Р. М. Шавяла // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне : энцыклапедыя. - Мінск, 1990. - С. 101–102.

Узгадваецца А. І. Федасюк.

**История** белорусской государственности : в 5 т. / [А. А. Коваленя и др. ; отв. ред. тома Н. Б. Нестерович] ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. - Минск : Беларуская навука, 2019. — Т. 4. Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939—1953 гг.). - 567 с.

См. на с. 396.

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раен : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 443–444. – (Імі ганарацца землякі).

**Сланеўскі, А.** Аляксандра Іванаўна Федасюк / А. Сланеўскі // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 116–118. (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне).

**Федосюк, А. И**. По велению сердца / Александра Ивановна Федосюк // Партийное подполье в Белоруссии, 1941–1944 : страницы воспоминаний. - Минск, 1986. - С. 319–325.

**Федасюк, А. І**. [Палітычная работа сярод насельніцтва была галоўнай у дзейнасці Дзівінскага падпольнага райкома партыі // Беларусь партизанская / сост. Р. А. Черноглазова.- Минск, 1990. - С. 54-55.

**Ус, А.** Судьба подпольщицы : [очерк о А. И. Федосюк] / А. Ус // В борьбе и труде : участие женщин Белоруссии в революционном движении, социалистическом и коммунистическом строительстве. - 2-е изд., перараб. и доп. -Минск : Беларусь, 1977. - С. 208–216.

**Давидович, М.** В революционном движении Западной Белоруссии / М. Давидович // В борьбе и труде : участие женщин Белоруссии в революционном движении,

социалистическом и коммунистическом строительстве. - Минск, 1985. - С. 166–185. - См. на с. 173, 185.

**Мазуров, К. Т.** Незабываемое / К. Т. Мазуров. – Минск : Беларусь, 1984. – 349 с., [12] л. ил.

См. на с. 286, 288, 299.

**Орехво, А.** С. Дела и люди КПЗБ : воспоминания / А. С. Орехво. – Минск : Беларусь, 1983. – 286 с., [8] л. ил.

См. на с. 191, 271.

**Калиберов, В. Ф**. Наши корреспонденты : [среди них А. И. Федосюк] / В. Ф. Калиберов // От сердца к сердцу : [воспоминания бывшего редактора областной подпольной газеты «Заря»] / Василий Федорович Калиберов. – Минск, 1981. – С. 39-49.

**Яковенко, В. К.** Партизанки / В. К. Яковенко. - Москва : Воениздат, 1980. - 304 с., [6] л. ил. – (Военные мемуары).

**Из справки** секретаря Антопольскго подпольного райкома КП(б)Б Брестской обл., А. И. Федосюк о росте и боевой деятельности подпольных организаций в Антопольском, Дивинском и Кобринском районах с апреля по ноябрь 1943 г. // Всенародное партизанское движении в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : в 3 т. - Минск, 1978. - Т. 2, кн. 2. -С. 478–480.

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 25-26 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**120 гадоў** з дня нараджэння А. І. Федасюк (1904) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 134-135.

**#Равнение** на героев. Женщина-легенда / подготовила Жанна Елизарова по материалам библиотеки военно-исторического музея им. А. В. Суворова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 16 верасня (№ 59). — С. 14—15 : фот.

Об А. И. Федосюк – деятеле национально-освободительного движения в Западной Белоруссии.

**Елизарова, Ж**. Герои кобринского подполья : авторский проект «Забвению не подлежит» / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 17 ліпеня. — С. 5.

**17 августа** 1904 г. Александра Федосюк // Советская Белоруссия. - 2019. — 17 августа. — С. 24.

В этот день родилась А. Федосюк — деятель революционного движения в Западной Белоруссии, уроженка д. Андроново.

**Сланеўскі, А.** Адна са 123-х / А. Сланеўскі // Звязда. – 1989. – 11 лістапада.

А. І. Федасюк – дэлегат з’ездаў КПЗБ, дэпутат Народнага сходу ў 1939 г.

**Саладков, И**. Женщина из легенды / И. Саладков // Советская Белоруссия. - 1985. - 18 мая.

**Ціхановіч, А. Пакаленні** / А. Ціхановіч // Звязда. - 1984. - 16 верасня.

**Саладков, И.** По мандату долга / И. Саладков, А. Гребенкина // Знамя юности. - 1978. - 19 декабря.

Рэгіён:
Кобрын
Кобрынскі раён
Андронава
Імёны:
Федасюк Аляксандра Іванаўна
Прадметы:
Дзеячы рэвалюцыйнага руху
Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны
Партызаны
Дзяржаўныя дзеячы